# Интеллектуальные викторины по истории

**В. В. Михальчик,**
учитель истории и обществоведения
УПК Гринковский детский сад – средняя школа Свислочского района

Активное формирование патриотизма через систему мероприятий и диалога всех заинтересованных структур и объединений, интеллектуальное развитие подрастающего молодого поколения являются сегодня одними из приоритетных векторов работы системы образования Республики Беларусь. Это очень сложный процесс.

Структурообразующими элементами в данной работе можно выделить следующие:

- ✓ семейное воспитание, заинтересованность родителей в качественном повышении уровня развития способностей ребёнка посредством вовлечения его в работу интеллектуальных клубов, творческих объединений по интересам;
- ✓ формирование уважительного отношения к малой родине, ее прошлому и настоящему, ведь наилучшим путем познания, принятия, восприятия духа народа всей страны является «глубокая любовь к родителям, отчему дому, селу или городу, народу и его языку, морали, обычаям, традициям, культуре» [1, с. 69];
- ✓ закладка основ патриотизма и интеллектуального самообразования с опорой на традиционные духовные ценности, устои традиционной культуры народа.

Немаловажную роль в практической реализации данных направлений имеет правильный выбор форм и методов, которые в достаточно простой, но познавательной и запоминающейся форме смогли донести до подрастающего молодого поколения основы патриотизма и заложили стимул для дальнейшего самосовершенствования. Наиболее эффективным средством являются интеллектуальныя викторины по истории, а также интеллектуальные игры.

Предлагаем вам интеллектуальную игру-викторину «Ці ведаем мы Беларусь», которая была проведена в рамках недели предметов гуманитарного цикла.

**Мэты:**

1. Падтрымліваць цікавасць да беларускай культуры як да духоўнага здабытку народа.
2. Выхоўваць любоў да Радзімы праз павагу да родных мясцін, гісторыі нашай дзяржавы.
3. Фарміраваць нацыянальна свядомую асобу.

4. Развіваць моўную культуру, пашыраць агульны кругагляд вучняў.

**Задачы:**

1. Дапоўніць, паглыбіць веды, уменні і навыкі, атрыманыя на ўроках мовы і літаратуры, гісторыі.
2. Развіваць творчыя здольнасці вучняў.
3. Узбагачаць слоўнікавы запас.
4. Выхоўваць пашану да роднага слова, жаданне карыстацца ім у паўсядзённым жыцці.

*Вось шарык маленькі ў касмічнай прасторы.*
*На ім ёсць лясы, акіяны і горы.*
*Вазьму на паліцы я мапу ці глобус,*
*Знайду частку свету пад назвай Еўропа.*
*Крыху павялічым карцінку ў памерах*
*(Вось Альпы, Карпаты, вось Балтыкі бераг)*
*І знойдзем заўсёды, удзень і уночы,*
*У цэнтры Еўропы "кляновы лісточак"*
*І назву, якой ўсё жыццё ганаруся:*
*Дзяржава Рэспубліка Беларусь!*
*(Алена Церашкова)*

## 1. Азнаямленне вучняў з правіламі віктарыны, вызначэнне асноўных момантаў

**Настаўнік**:

Беларусь мая сінявокая! Якая прыгожая назва ў нашай краіны. Беларусь! А яшчэ мы завём яе Радзіма. А яшчэ Бацькаўшчына. Радзіма – бо тут мы нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін на цэлым свеце. Бацькаўшчына – бо яна нам дасталася ад нашых бацькоў. А ім ад іхніх бацькоў – нашых дзядоў. А далей ад прадзедаў, ад прапрадзедаў… І так аж да самых далёкіх продкаў. На нашай беларускай зямлі багата рэк, азёр, а ў жыце ўлетку цвітуць блакітныя васількі. Беларусь – наша Радзіма .

Мы сабраліся сёння, каб пашырыць свой кругагляд па гісторыі Беларусі, яе літаратурным і гістарычным мінулым і зазірнуць у будучае, паспрабаваць свае сілы ў конкурсе ведаў, шчыра парадавацца за тых, хто сёння пераможа, а ўдзельнікамі віктарыны будуць усе прысутныя. Але перад тым, як мы пачнём нашу гістарычную віктарыну, дазвольце мне распавесці пра асноўныя правілы паводзін падчас гульні.

**Асноўныя правілы паводзін падчас гульні**

1. З павагай адносімся адзін да аднаго.
2. Любая думка заслугоўвае увагі.
3. Пакуль адзін гаворыць, усе яго слухаюць.
4. Аб сваім жаданні выказацца гаворым з дапамогай паднятай рукі.

**Настаўнік:**

А зараз пачынаем віктарыну, якая называецца «Старонкі культуры нашай Радзімы». Адной з самых папулярных інтэлектуальных тэлевізійных віктарын

з’яўляецца «Свая гульня». Наша віктарына будзе ў нечым напамінаць гэтую гульню. На дошцы вы бачыце 4 раздзелы па 5 пытанняў у кожным. Любое пытанне тэмы мае сваю колькасць балаў – ад 1 да 5. Чым вышэй колькасць балаў за пытанне, тым яно больш складанае. Капітан выбірае раздзел і колькасць балаў за пытанне, пасля чаго яно зачытваецца ўслых. Даецца 30 секунд на абмеркаванне, пасля гэтага капітан можа падняць «сігнал» і адказаць на яго. У выпадку правільнага адказу балы залічваюцца на рахунак каманды, а капітан атрымлівае права выбраць наступнае пытанне. Калі ж адказ няправільны, то каманда-саперніца мае права адказаць на яго. Калі на працягу наступных 5 секунд ніхто на яго не адказаў, вядучы робіць гэта сам, а наступнае пытанне выбірае капітан каманды-саперніцы. Віктарына працягваецца да таго часу, пакуль не будуць дадзены адказы на ўсе пытанні.

Гульнявое поле «Старонкі культуры нашай Радзімы»

| № п/п | Намінацыя | Колькасць балаў | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | **Дзяржава і яе сімвалы** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| **2** | **У свеце народных традыцый** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| **3** | **Зямля пад белымі крыламі** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| **4** | **І льецца песня над зямлёю** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |

**Пытанні да гульні «Старонкі культуры нашай Радзімы»**

**Намінацыя «Дзяржава і яе сімвалы»**

**Пытанне (1 бал)** Кожны год у нашай краіне ладзіцца шмат святочных мерапрыемстваў, прымеркаваных да розных памятных падзей. Летам мы адзначаем надзвычай важнае і любімае народнае свята. На яго заўсёды запрашаюць шмат гасцей з розных краін свету. Гэта свята сімвалізуе еднасць народа і дзяржавы, нашу самабытнасць. Адзначаецца яно ў дзень вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў. Як называецца гэта свята і калі адзначаецца? **(Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, або Дзень Рэспублікі – 3 ліпеня.)**

**Пытанне (2 балы)** Кожная дэталь у гэтым дзяржаўным сімвале мае сваё значэнне. Зялёны колер тэрыторыі Беларусі ў залатых промнях узыходзячага Сонца гаворыць аб тым, што ўсе свае думкі грамадзяне скіроўваюць да Айчыны: гэта наша зямля, нам чужой не трэба. Але і сваёй не аддамо. Контур

краіны знаходзіцца ў сярэдзіне сімвала, утворанага вянком з каласоў. Пра які дзяржаўны сімвал ідзе размова? **(Герб.)**

**Пытанне (3 балы)** Наш сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны, белы. Чырвоны колер служыць знакам Сонца, сімвалізуе братэрства. Зялёны колер – Прырода. Гэта палі, лясы краіны. Гэта колер дабра, росту, развіцця, дабрабыту і міру. Што сімвалізуе белы колер і арнамент? **(Белы колер – колер свабоды, маральнай чысціні і мудрасці. Арнамент сімвалізуе працавітасць, народнае майстэрства.)**

**Пытанне (4 балы)** Гімн расказвае пра мінулае беларускага народа, у ім гучыць пажаданне славы, росквіту, вечнага жыцця Беларусі, заклік любіць і шанаваць Радзіму. Хто з’яўляецца аўтарам музыкі і тэксту Дзяржаўнага гімна? **(Музыка Нестара Сакалоўскага, словы Міхася Клімковіча, Уладзіміра Карызны.)**

**Пытанне (5 балаў)** Назавіце важнейшае права чалавека, якое замацавана ў Канстытуцыі. **(Права на жыццё.)**

**Намінацыя «У свеце народных традыцый»**

**Пытанне (1 бал)** Падчас гэтага свята хлопцы і дзяўчаты водзяць карагоды, скачуць праз вогнішча і шукаюць самую чароўную кветку шчасця. **(Купалле.)**

**Пытанне (2 балы)** На якое вясёлае свята пачыналі гукаць вясну? **(Масленіца.)**

**Пытанне (3 балы**) Як называецца свята, калі ўшаноўваюць памяць памерлых продкаў? **(Дзяды.)**

**Пытанне (4 балы)** Найвялікшае каляндарнае свята, з пашырэннем хрысціянства прыстасавана да ўваскрашэння Хрыста і стала рухомым. Адзначаецца з 4 красавіка да 8 мая. **(Вялікдзень.)**

**Пытанне (5 балаў)** На якое свята спявалі прыпеўку:

Ой, чыя то дачка, як ягадачка,
Святы вечар добрым людзям!
Бацькова дачка, як ягадачка.
Як у сені ўвайшла – сені заззялі.
Як у хату ўвайшла – паны паўставалі. **(Каляды.)**

**Намінацыя «Зямля пад белымі крыламі»**

**Пытанне (1 бал**) Якая птушка з’яўляецца сімвалам нашай краіны? (Бусел.)

**Пытанне (2 балы**) Якую расліну – сімвал беларускай зямлі – згадвае М. Багдановіч у славутым вершы «Слуцкія паясы». (Васілёк.)

**Пытанне (3 балы)** Якое дрэва распусціла галлё над курганам у знакамітай паэме Янкі Купалы «Курган»? (Дуб.)

**Пытанне (4 балы)** Самая магутная жывёла нашых лясоў, якая захавалася толькі ў знакамітай пушчы. Мікола Гусоўскі прысвяціў паляванню на гэту жывёлу шмат радкоў сваёй паэмы. (Зубр, Белавежская пушча.)

**Пытанне (5 балаў)** Самае старажытнае дрэва ў нашых лясах. Гэта асноўная парода, якая дае драўніну для будаўніцтва, вытворчасці

высокаякаснай паперы, штучных валокнаў. З яго драўніны вырабляюць музычныя інструменты. (Елка.)

**Намінацыя «І песня льецца над зямлёю» (адгадаць песню)**

**Пытанне (1 бал)** Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь
**Пытанне (2 бала)** Касіў Ясь канюшыну
**Пытанне (3 бала)** Белавежская пушча
**Пытанне (4 бала)** Калыханка
**Пытанне (5 балаў)** Ксенія Сітнік – песня для Еўрабачання

## 2. Конкурс перакладчыкаў

**Настаўнік:**

Малайцы!!! Я вельмі рады за вас, за вашы веды па гісторыі культуры Беларусі і спадзяюся, што ад гэтай гульні вы атрымалі асалоду. А зараз мы пераходзім да наступнага конкурсу. У нашай краіне, як вы ўжо ведаеце, існуюць раўнапраўныя дзве мовы: руская і беларуская. Кожны мае права згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь выбіраць мову, на якой будзе гаварыць. Але паўсядзённае жыццё сучаснага школьніка поўна шматлікімі прыказкамі, прымаўкамі яшчэ з тых далёкіх часоў, што вельмі цяжка бывае іх перакласці і зразумець сэнс. Зараз я прапаную вам лінгвістычнае заданне – стаць на некалькі хвілін і збіральнікамі прыказак - прымавак, і адначасова іх перакладчыкамі на іншую мову. Вы атрымоўваеце лісткі з словамі, паспрабуеце з іх скласці беларускую прыказку і як мага дакладней перакласці яе на рускую мову. За кожную правільна складзеную прыказку і яе дакладны пераклад вы можаце атрымаць 2 балы. Час выканання задання – 5 – 7 хвілін. Пачынаем!!!

**Беларускія прыказкі: У страху вочы па яблыку. Калі Бог не папусціць – свіння не укусіць. Ні адказу – ні прыказу. Пакуль жаніцца – загаіцца.**

**Русские пословицы: У страха глаза велики. Бог не выдаст – свинья не съест. Ни ответа – ни привета. До свадьбы заживет.**

## 3. Азнаямленне вучняў з гістарычнай спадчынай Рэспублікі Беларусь, вандроўка па памятных мясцінах Радзімы, стварэнне брэндавых артыкулаў.

**Настаўнік:**

Канікулы – час адпачынку, калі кожны імкнецца змяніць абстаноўку, атрымаць новыя незвычайныя ўражанні, даведацца пра нешта цікавае. Вось і вы пасля канікул ў школе не можаце нагаварыцца з сябрамі, так вас перапаўняе жаданне падзяліцца, хто дзе быў, хто што бачыў. Нехта ездзіў за мяжу, хтосьці – у санаторый ці пабываў у школьным лагеры. Магчыма, камусьці пашанцавала трапіць на экскурсію ці ў сапраўднае падарожжа.

Пытанне да вас, сябры. Як вы самі лічыце, ці варта турыстам ехаць у Беларусь? Ці ёсць ім што ў нас паглядзець? Ці маем мы што паказаць?

**Сцэна "Брэнд" (напісанне альбо вуснае прадстаўленне інфармацыі аб вядомых турыстычных аб’ектах)**

**Настаўнік:**

Дзякуй вялікі, дзеці, за такія грунтоўныя і правільныя адказы. Вы назвалі, бадай, самыя знакамітыя помнікі гісторыі і культуры беларускага народа. А зараз мы выканаем яшчэ адно заданне: напішам кароткі рэкламны артыкул. Вы бачылі такія артыкулы ў прэсе, прысвечаныя прывабным мясцінам, зонам адпачынку, метадам лячэння і г.д. Вось і ваша задача – папрацаваць над такім артыкулам. Будзьце шчырымі і не бойцеся крыху фантазіраваць: вашы думкі з цягам часу лёгка могуць стаць рэальнасцю. Асноўная задача – каб той, хто чытае артыкул, сапраўды паверыў, што наша – лепшае! Час – 10 хвілін. Максімальная колькасць балаў – 10. (Вызначаецца лепшы артыкул, лепшы прамоўца і лепшы крытык.)

## 4. Заканчэнне мерапрыемства

**Настаўнік:**

Вось і завяршылася наша падарожжа па незабыўных сцежках культуры роднага краю. Няхай гэтыя светлыя пачуцці заўсёды жывуць у вашых сэрцах, выклікаюць толькі радасць, і няхай кожны з вас адчувае сябе сынам або дачкой сваёй зямлі.

Я - беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі.
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

Я - беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя.
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.

Я - беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую і здалля.

Я - беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
“Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу.”

Высока ў небе вырай кружыць,
Ляціць за сіні небакрай.

Не забывай ніколі, дружа,
Сваю зямлю, свой родны край!
*Н.Гілевіч*

**Рэфлексія:**

1.Ці спадабалася вам мерапрыемства?
2.Што вам запомнілася найбольш?
3.Як трэба адносіцца да гісторыі і культуры сваёй Радзімы?

**Литература**


1. **Лаптенок, С. Д.** Формирование ценностно-патриотических установок в сознании и реальном поведении молодежи / С.Д. Лаптенок // Чалавек. Грамадства. Свет. – 2000. – № 4. – С. 64 – 70.
2. **Памяць:** Свіслачскі р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / Рэдкал. І. І. Варанец і інш. – Мн.: Беларусь, 2004. – 526 с.: іл.
3. **Счастный, В.** Патриотическое воспитание молодежи в современных условиях / В. Счастный // Адукацыя і выхаванне. – 2003. – № 6. – С. 28 – 33.